**В номере:**

Источники долголетия с. 6



Куда девать живую елку? с. 11



Искусство – в подарок с. 6



Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№2 (10920)

11 студзеня 2020 года

Субота

ТРАДЫЦЫІ



# Каляда спяшае ў дом і мяхі нясе з дабром

## У ГДК "Меліяратар" праходзяць апошнія рэпетыцыі каляднага прадстаўлення

Інжынер па гуку гарадскога Дома культуры Юрый Ерафеенка з нецярпеннем чакае навагодніх святаў. У гэтыя дні ёсць магчымасць прадэманстраваць свае акцёрскія здольнасці. За тры апошнія тыдні ў ролі Дзеда Мароза Юрый паспеў павіншаваць сотні дзяцей і выступіць у тэатралізацыях.

– Больш за ўсё люблю стары Новы год, – прызнаецца суразмоўца. – Памятаю, як у маладосці з сябрамі-калядоўшчыкамі хадзілі па родных і знаёмых з музыкай і спевамі.

Сёлета Юрый разам з калектывам ГДК пазнаёміць з традыцыямі старадаўняга шчадравання жыхароў Добруша на цэнтральнай сцэне горада.

– У адрозненне ад традыцыйных святаў, у гэты раз ухіл робім не на тэатралізацыю, а на абрадавы складнік Шчодрага вечара, – анансуе мерапрыемства дырэктар ГДК "Меліяратар" Людміла Сямак. – Будуць і варажба, і жарты. У музычнай частцы ўдзел прымуць творчыя калектывы "Сударушка" і "Світанак".

Па словах суразмоўцы, упершыню на цэнтральнай сцэне выкарыстаюць такую форму забавы, як флэш-моб. Акцёры роставых лялек развучылі арыгінальныя "па" для дэманстрацыі перад удзельнікамі дыскатэкі. Танцавальныя гульні разлічаны як на дзіцячую, так і дарослую аўдыторыі.

– Апрабавалі такую форму работы з гледачамі падчас святкавання Новага года, – расказвае Людміла Сямак. – Прынялі яе, як кажуць, на "ўра".

**Сяргей ВОЛЬГІН**

**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

ISSN 2073-1000

**погода**

**Долгота дня 7.47**
**Луна**
**11 января – в Раке,**
**12, 13 – во Льве**



**Полнолуние**

**12 января**

**НОЧЬЮ 0…+1**
**ДНЕМ -1…0**
Пасмурно.
Без осадков.
Ветер ю.-западный 2-5 м/с.

**13 января**

**НОЧЬЮ 0…+1**
**ДНЕМ +2…+3**
Пасмурно.
Без осадков.
Ветер западный 2-4 м/с.

ТЕМА НЕДЕЛИ

# Традиция с особым смыслом

## Президент вручил премии «За духовное возрождение»



Президент Беларуси Александр Лукашенко вручил премии «За духовное возрождение», специальные премии деятелям культуры и искусства и премии «Белорусский спортивный Олимп».

Церемония состоялась во Дворце Республики.

Глава государства отметил, что вручение премии – это отличная традиция, которая придает рождественским праздникам особенный смысл. «Этот вечер мы посвящаем нашим соотечественникам – тем, кто сохраняет и обогащает национальную культуру Беларуси, каждый год удивляет нас невероятными достижениями», – сказал Президент.

По его словам, высокие стремления людей, отмеченных премиями, не вписываются в каноны современного прагматичного мира, где все продается и покупается, а мораль и справедливость обесцениваются. «Великую идею служения обществу и государству номинанты премии ставят выше материальной выгоды, своими делами и поступками укрепляют в наших сердцах веру в добро и чистоту помыслов», – заявил Александр Лукашенко.

Такой пример, подчеркнул он, вызывает чувство гордости за белорусский народ, который сохранил лучшие национальные черты: отзывчивость и великодушие, трудолюбие и целеустремленность, истинный патриотизм.

Президент назвал символичным: среди обладателей премии «За духовное возрождение» в этом году – Белорусское общественное объединение ветеранов. «Отметим их вклад в сохранение памяти о подвиге народа и активную гуманитарную деятельность», – сказал он. А традиционная премия «Белорусский спортивный Олимп», по словам Александра Лукашенко, должна вдохновить спортсменов на новые свершения на предстоящих Олимпийских играх в Токио.

Как сообщалось, по итогам 2019 года присуждены пять премий «За духовное возрождение». Ими отмечены трудовые коллективы и представители религиозных объединений за активную деятельность в гуманитарной сфере.

**По материалам БелТА**

ВЕСТКІ З МЕСЦАЎ

## Святочныя рэйсы

**Упрыгожаны пасвяточнаму гарадскі аўтобус больш за тыдзень знімае негатыўныя эмоцыі дабрушан ранкам і пасля працоўнага дня.**

Гэта пацвярджаюць і кіроўцы МАЗа-103 Алег Кір'янаў і Віктар Шустаў.

– Ідэя аздобіць адну з транспартных адзінак, што працуе на ажыўленым гарадскім маршруце "Меліяратар – Гогаля", прыйшла да нас у пераднавагоддзе, – адзначае дырэктар філіяла №10 акцыянернага таварыства "Гомельаблаўтатранс" Аляксей Сінажэнскі. – Накont аб'екта афармлення не сумняваліся: новы аўтобус атрымалі напрыканцы жніўня. А вось над тэхнікай упрыгожвання працавалі калектыўна – ад механіка да спецыялістаў аддзела перавозак. Праявілі і знаходлівасць, і творчасць...

У выніку транспарт істотна змяніў будзённы выгляд. Вокны звонку аздоблены светадыёднымі лентамі, у салоне – музыка, святочныя гірлянды, мішура, табло з навагоднімі віншаваннямі. Пакідаючы аўтобус, многія пасажыры выказваюць транспартнікам удзячнасць за прыўзняты настрой і крэатыў. Святочныя рэйсы прадоўжацца да старога Новага года.

**Мікалай ЖДАНОВІЧ**

## Майстар-класы ад настаўнікаў

**Распачаўся раённы этап конкурсу прафесійнага майстэрства "Настаўнік года".**

Як паведамілі ў аддзеле адукацыі райвыканкама, барацьбу за выхад у фінал прадоўжаць пяць настаўнікаў школ і столькі ж педагогаў дашкольнай адукацыі. Яны правядуць адкрытыя заняткі ў незнаёмым класе і дадуць майстар-класы.

Конкурс прафесійнага майстэрства сярод педагогаў праводзіцца раз у тры гады. У мінулы раз прадстаўніца нашага раёна – настаўнік пачатковых класаў Крупецкай сярэдняй школы-дзіцячага садка Святлана Андрыянава – стала фіналісткай заключнага этапу, яе майстар-клас быў прызнаны лепшым на ўзроўні рэспублікі.

**Людміла НАЗАРАВА**

НА СВЯЗИ

**13 января с 10.00 до 12.00 по телефону 5-98-53**
пройдет прямая телефонная линия с участием Александра Михайловича БОРСЯКОВА, начальника управления по труду, занятости и социальной защите райисполкома.

* * *

**16 января с 11.00 до 12.30 по телефонам 8(0232)23-83-97, 23-83-88**
пройдет горячая линия Комитета государственного контроля Гомельской области по вопросам законности и эффективности использования земель для добычи общераспространенных полезных ископаемых на территории области.

ПРИЕМ

**17 января с 10.00 до 12.00**
в здании районного исполнительного комитета прием граждан и представителей юридических лиц проведет Александр Иосифович КАЧАН, начальник главного управления торговли и услуг Гомельского областного исполнительного комитета.
**Предварительная запись на прием – с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по телефону 3-29-52.**

НАШЫ ДЗЕЦІ

# Цуды творыць дабрыня

**Весела адсвяткавалі Раство ў Насовіцкім Доме культуры.**

– Гэта свята трэба сустракаць у сям'і. На жаль, не ўсе дзеці маюць такую магчымасць, – гаворыць прыёмная маці Святлана Жыхарава. – На святло нашай калядной зоркі завіталі дзеці, што выхоўваюцца ў прыёмных і апякунскіх сем'ях, выхаванцы прытулку, дзеці-інваліды.

Каб стварыць для дзяцей свята, арганізатары запрасілі артыстаў гарадскога Дома культуры "Меліяратар" з казачным прадстаўленнем. Шоу мыльных бурбалак ад клоўна з абласнога цэнтра выклікала шквал эмоцый і ў самых маленькіх, і ў падлеткаў.

Набыць падарункі дзецям дапамаглі насаўляне, што паўдзельнічалі ў акцыі па зборы сродкаў, і тыя, хто прыйшоў на дабрачынную дыскатэку. Сабраных сродкаў хапіла на 45 салодкіх набораў.

**Наталля ХАДУНЬКОВА**

СПРАШИВАЛИ – ОТВЕЧАЕМ

# Почта на колесах – мера временная

**Жители Жгунской Буды обеспокоены закрытием местного отделения почтовой связи.**

Говорят: ранее отправить корреспонденцию, оплатить коммунальные услуги или снять наличные с карточки можно было в любое время в течение рабочего дня. Сейчас же приходится ждать приезда «почты на колесах». С чем связаны такие изменения? – спрашивали жители деревни.

– Стационарное отделение почтовой связи закрыто временно, – сообщила начальник Добрушского участка почтовой связи Елена Трубкина. – Прежний начальник отделения уволился, ищем подходящую кандидатуру на открывшуюся вакансию.

По словам собеседницы, сейчас жителей Жгуно-Буды обслуживают передвижное отделение почтовой связи и два почтальона. Со вторника по субботу машина почтовиков по два часа находится на улице Школьной возле здания почтового отделения. Перечень оказываемых услуг – прежний.

Некоторые изменения в работе почтовой связи произошли и в поселке Рассвет. С начала года его жителей обслуживает передвижное отделение №1. Таким способом здесь доставляются газеты, пенсии, письма и пособия. Население обслуживается в течение часа с 8 часов 45 минут. Кроме того, здесь изменен почтовый индекс на 247058.

**Соб. инф.**

**Фото носит иллюстративный характер**

